**УДК 821.161.3** **DOI 10.52928/2070-1608-2024-72-4-48-52**

# АЎТАБІЯГРАФІЧНАЕ, ДАКУМЕНТАЛЬНАЕ І МАСТАЦКАЕ ЯК КАМПЛЕМЕНТАРНЫЯ СРОДКІ КАНСТРУЯВАННЯ РЭЧАІСНАСЦІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў АПОВЕСЦІ «ЗОЛАК, УБАЧАНЫ ЗДАЛЁК» Я. БРЫЛЯ

***д-р філал. навук, дац. З.І. ТРАЦЦЯК***
**(*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасініі Полацкай*)**
***e-mail:* *zoya.tretyak@rambler.ru***

*У артыкуле разглядаецца аповесць Я. Брыля «Золак, убачаны здалёк», прысвечаная асэнсаванню феномена «навала-кантынуум», што ўбірае ў сябе падзеі Першай сусветнай вайны. Паводле аўтарскай задумы, апавядальнік, які намінальна не мог быць свядомым сведкам баявых дзеянняў, паступова рэканструюе падзеі 1914–1918 гг., якія адбіліся на жыцці яго сям'і і аднавяскоўцаў (шырэй – беларускага народа). Адзначаецца камплементарная роля візуальнага і вербальнага аспектаў спасціжэння ваеннай рэчаіснасці. Падкрэсліваецца сугестыўны патэнцыял літаральна кожнага матэрыяльнага аб'екта, аповеду ўдзельніка падзей, дакументальнай, фальклорнай ці літаратурна-мастацкай крыніцы, якія ў сукупнасці дазволілі апавядальніку стварыць адэкватны слоўны малюнак сусветнай вайны. Вызначаны шэраг рыс, якія сведчаць пра сувязь твора з метапрозай, што вызначае канцэптуальна адрознае месца аповесці ў шэрагу беларускай літаратурнай баталістыкі, прысвечанай падзеям 1914–1918 гг.*

***Ключавыя словы:*** *Першая сусветная вайна, беларуская літаратура, Я. Брыль, аўтабіяграфічны, дакументальны, мастацкі элементы аповеду, метапроза.*

**Уводзіны.** Аповесць «Золак, убачаны здалёк» Янкі Брыля вызначаецца адметнай літаратурна-мастацкай канцэпцыяй адлюстравання падзей першай паловы XX ст., у тым ліку вайны 1914–1918 гг. На думку Д. Бугаёва, вартасці згаданага твора звязаны не толькі з моцным «антываенным пафасам, але зноў жа і з стылёва-выяўленчай навізной, цікавай арганізацыяй апавядальнай плыні, у якой спалучаецца некалькі часавых зрэзаў» [1, с. 37]. Кніга сведчыць пра падвышаную пісьменніцкую ўвагу да феномена «аўтабіяграфічнай прозы, у якой галоўным аб'ектам для спавядальнай рэфлексіі робіцца ўласнае жыццё» [2, с. 84]. Сам празаік адзначаў: «столькі ўжо я апублікаваў пра самога сябе, да дзённікавых запісаў уключна, што не схавацца мне за ніякіх Януляў і Ясюляў, тым больш што і не надта я на гэта здольны» [3, с. 564]. Сінтэз аўтабіяграфічнага, што «адыгрывае ролю інструмента пазнання і стварэння сугестыўна напоўненай чалавечай духоўнасцю мастацкай рэчаіснасці» [4, с. 14], і мастацкага адбіўся на абранай Я. Брылём аповедавай стратэгіі: галоўны герой аповесці «Золак, убачаны здалёк» рухаецца ў плыні ўласных успамінаў пра маленства і юнацтва, балансуе на мяжы непасрэднай наіўна-эмацыйнай рэакцыі дзіцяці на новыя, таму надзвычай цікавыя, з'явы і працэсы і роздуму дарослага чалавека, які ўдакладняе і сістэматызуе некалі перажытае, абапіраючыся на набыты вопыт і сфарміраваны светапогляд. У абодвух выпадках Першая сусветная вайна разглядаецца дыяхронна, але павелічэнне часавай дыстанцыі адбіваецца на ўспрыняцці пэўных артэфактаў, якія ўзнаўлялі будзённасць вайны (акопы, бліндажы, калючы дрот, рэшткі разбураных збудаванняў, што захаваліся ў наваколлі), знешняга выгляду і паводзін інвалідаў вайны, псіхічна хворых і калекцывільных, аповедаў сведкаў гэтай навалы. З цягам часу яны набываюць усё большую сэнсавую насычанасць, прыадчыняюць новыя грамадскія, маральна-этычныя і філасофскія праблемы. На думку Л. Скібіцкай, чытач назірае, як «ствараецца поліфанічная кампазіцыя, што дазваляе свабодна, натуральна спалучаць рознаскіраваныя з'явы, тэндэнцыі, аспекты» [5, с. 128].

Відавочная прыналежнасць аповесці да дакументальна-мастацкай прозы патрабуе ўдакладнення яе жанравых вытокаў. Абапіраючыся на класіфікацыю Л. Сіньковай прозы fiction [6, с. 78], адзначым, што твор Я. Брыля звязаны з акцэнтаванай фактаграфічнай асновай, дзе спалучыліся аўтабіяграфічнае і факты з быцця іншых людзей у варунках гісторыі (у тым ліку звязанае з успрыняццем помнікаў вуснай народнай творчасці, «насценнай літаратуры» [7, с. 447], кшталту надпісаў 'Villa Leischen' і адраса казака з данской станіцы, «пісьмовых помнікаў прыфрантавой паласы: кніг, падшывак ілюстраваных часопісаў, паштовак патрыятычнага зместу» [7, с. 446], салдацкага і бежанскага наратыву). Паказальна, што Я. Брыль выпрабоўвае пэўныя прыёмы метапрозы: галоўны персанаж – герой, надзелены творчымі здольнасцямі, які ўспрымаецца як адмысловае 'alter ego' самога аўтара; у аповесці ўзаемадзейнічаюць два важкіх элемента: «рамка» і непасрэдна «тэкст у тэксце»; пісьменнік так ці інакш вымушае чытачоў пільна сачыць не толькі за адмысловым падзейным складнікам, шчыльна звязаным з аналітычным рухам думкі апавядальніка, але і за працэсам нараджэння новай мастацка-літаратурнай рэальнасці, прыёмамі яе стварэння і прынцыпамі існавання.

Мэта даследавання: вызначыць спецыфіку мастацкага ўвасаблення Першай сусветнай вайны ў аповесці «Золак, убачаны здалёк».

**Асноўная частка.** У аповесці «Золак, убачаны здалёк» фіксацыя візуальнага і тактыльнага як аснова ведаў пра Першую сусветную вайну паступова саступае месца вербальнаму. Спачатку апавядальнік уважліва слухаў каментары-тлумачэнні дарослых пра ўсе напаміны пра вайну, што трапляліся яму ледзь не кожны дзень, больш разгорнутыя і дэталізаваныя гісторыі ўдзельнікаў і сведкаў Першай сусветнай, якія жывілі яго няўрымслівую

фантазію. Не меншую цікаўнасць нараджалі пачутыя песні, прыпеўкі, узоры салдацкага наратыву, што існавалі ў розных варыяцыях. Памяць галоўнага героя аповесці захавала як найлепшыя ўзоры народнай творчасці, так і той ваенны фальклор, які ён сам пазней назваў «бруднымі пацяробкамі з афіцэрскіх і салдацкіх сталоў, якімі доўга ласаваліся і моладзь, і цікаўная малеча» [7, с. 447]. Сапраўдная вартасць гэтай «творчасці» стала відавочнай у сталым узросце, калі персанаж заглыбіўся ў маральна-этычныя пытанні, звязанныя з пасляваеннай рэчаіснасцю. Апавядальнік прыгадвае, як намнога пазней удумліва знаёміўся з дакументальнай і мастацкай літаратурай на тэму вайны і, у рэшце рэшт, стварыў уласны слоўны малюнак навалы.

Мастацкі складнік твора верыфікуецца праз дакумент: у машынапісным плане аповесці «Золак, убачаны здалёк», захаваным у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва, Я. Брыль падрабязна ўзнавіў працэс свайго знаёмства з падзеямі Першай сусветнай вайны, асноўныя этапы якога, паводле пісьменніцкай задумы, карэлююць з досведам галоўнага героя аповесці. Празаік падкрэсліў, што «вайну, што канчалася ў яго маленстве, ён уяўляў па расказах і апісаннях. Расказы землякоў, былых удзельнікаў вайны, якіх ён наслухаўся раней <…>, чым начытацца апісанняў гэтай вайны, мастацкіх і немастацкіх, раней, чым убачыць тую вайну адлюстраванай у фатаграфіях і малюнках, у дакументальным і мастацкім кіно» [8, арк. 2]. Адзначаючы значнасць вербальнай (адносна суб'ектывізаванай, заснаванай на досведзе сведак ці ўдзельнікаў падзей) першакрыніцы ўласных уяўленняў пра вайну, пісьменнік дэталёва спыняецца на асабістых уражаннях ад пазнейшага па часе знаёмства з фотаздымкамі, «living рознымі па сваёй свядомай ці больш несвядомай адноснай аб'ектыўнасці» [8, арк. 2]. Асабістая зацікаўленасць у тэме Першай сусветнай вайны нарадзіла ў празаіка пытанне пра праўдзівасць набытай з розных крыніц інфармацыі. У эсэ «Адзінае наша» Я. Брыль прапануе ўласныя высновы: «у маім даваенным вясковым акружэнні жыло нямала ўдзельнікаў і руска-японскай, і "мікалаеўскай", і грамадзянскай войнаў. І шчасліва ўцалелых, і так ці інакш пакалечаных, напоўненых невычэрпным запасам жахаў. Іх расказы мы, юнакі, слухалі – калі мне меркаваць па сабе – з пранозлівай жудасцю. Расказвалі некаторыя так, што іх расказы сваёй, нічым не прыкрытай, грубай народнай праўдзівасцю адпавядалі таму лепшаму, што я чытаў пра вайну, а то і гаварылі яшчэ больш, куды мацней уражвалі, наводзілі на нялёгкі роздум» [9, с. 204]. Асобныя моманты, звязаныя з гісторыяй стварэння аповесці, узноўлены ў нататках «Свае старонкі», дзе Я. Брыль, напрыклад, прыгадвае гісторыю пра «двух байстручкоў – Казака і Немца, адзін ад арэнбургскага казака, другі ад немца, сыны дваюрадных сясцёр. Бедныя няшчасныя хлапчукі. Як іх зводзілі біцца, нібы пеўняў, і яму тады шкада іх было і не смешна» [3, с. 554]. Гэта гісторыя потым увайшоў у аповедавую канву твора.

Акрамя таго, у эсэ «Адзінае наша» і машынапісным плане аповесці «Золак, убачаны здалёк» Я. Брыль пазначае тыя літаратурныя і дакументальныя крыніцы, якія паўплывалі на яго досвед: некалі празаіка ўразілі «антываеннае слова Талстога і Гаршына, Рэмарка і Гашака» [9, с. 204], кнігі Э. Людэндорфа і Я. Тарле. Пісьменнік палічыў неабходным падкрэсліць, што «"Агонь" Барбюса, "На імперыялістычнай вайне" Гарэцкага <…> ён прачытаў пасля Вялікай Айчыннай» [9, с. 205]. У машынапісе сустракаюцца і асобныя вытрымкі з рамана А. Цвейга «Зацішак». Відавочна, што гэтыя літаратурна-мастацкія і дакументальныя крыніцы падштурхоўвалі Я. Брыля да пошукаў уласнага адметнага слова пра падзеі 1914–1918 гг.

Адзначым, што Я. Брыль абірае нетыповую для твора ваеннай тэматыкі постаць галоўнага героя-апавядальніка, якога складана назваць свядомым відавочцам узброенай барацьбы 1914–1918 гг. Набыты досвед той навалы звязаны з развіццём свядомасці і дапытлівага розуму дзіцяці, а затым падлетка, які з цікавасцю ўзіраецца ў будзённае, літаральна прасякнутае напамінамі пра баявыя дзеянні недалёкага мінулага. Гледзячы на мілітарызаваны ландшафт і побыт вёскі, слухаючы аповеды дарослых, персанаж фактычна не размяжоўвае Першую сусветную, рэвалюцыю і іншыя падзеі, што выходзяць за межы яго асабістага вопыту («Час у маленстве вымяраецца днямі. Два, тры гады таму назад – гэта ўжо вельмі многа, а тое, што было да нас, да нашага ўступлення ў свядомасць – ужо і наогул легенда» [7, с. 445]). У той жа час ён адчувае бясконцасць выпрабаванняў, якія напаткалі родзічаў і грамаду («у разуменні і адчуванні <…> усіх дарослых людзей той руска-нямецкі фронт, тая вайна былі зусім нядаўна. Бо на немцах яна не закончылася: пасля іх была "свабода", потым белапалякі, тады бальшавікі, зноў палякі» [7, с. 436–437]), усведамляе, што яго жыццё таксама неяк далучана да гэтых сацыяльных працэсаў. Так паступова нараджаецца ідэя пра ўласнае існаванне ў плыні навалы-кантынуума, асабліва інтэнсіўна ўсвядомленае, калі апавядальнік партызаніць у часы Вялікай Айчыннай і фармулюе ўласную канцэпцыю татальнай вайны. У сталым узросце ўспрыманне асабістай жыццёвай гісторыі абвастраецца і ўскладняецца, бо яна ўводзіцца ў шырокі кантэкст нацыянальнага мінулага. Паводле Алеся Адамовіча, задума аповесці выспявала не толькі на грунце ўспамінаў пісьменніка пра дзяцінства і юнацтва, але і з шматгадовай працы над кнігай «Я з вогненнай вёскі»: «прайшоўшы па дантавых кругах хатынскай памяці народнай, яшчэ больш станеш цаніць светлае, добрае, дзіцячае ў жыцці. Але ўжо і *тое* будзе стаяць заўсёды – за ўсім, пра што б ты ні пісаў» [10, с. 7].

У аповесці «Золак, убачаны здалёк» Я. Брыль канцэтруецца на ўражаннях апавядальніка ад гісторый свайго дзядзькі (прататып – стрыечны брат пісьменніка, старэйшы за яго на дваццаць сем год): георгіеўскага кавалера, «беларускага Грышкі Мелехава» [11, с. 215], ва ўспамінах якога «неаднойчы паўтаралася то храбрасць, гордасць за сваё, то чалавечы жах і праклёны на тых, праз каго дарма лілася кроў, – цар, царыца, Распуцін, буржуі, свае і нямецкія» [7, с. 506]. Досвед гэтага героя не ўспрымаецца як тыповы, бо ён канцэнтруе ў сабе цэлы калейдаскоп з розных па часе эпізодаў: «як яны перлі з Усходняй Прусіі і ў яго за адну ноч конь раскаваўся на ўсе чатыры нагі. Як за Каўказам туркі ў чырвоных шапках ішлі на яго кулямёт <…> Як у Галіцыі … Як каля возера Нарач …» [7, с. 472]. Відавочна, што персанаж перарываў і без таго фрагментарны і асацыятыўны аповед, бо

часам не паспяваў за плынню ўласных успамінаў, часам не жадаў траўмаваць прысутных малапрыемнымі рэаліямі вайны, таму яго вонкава крыху блытаныя, але ўнутрана сэнсава насычаныя і камплементарныя разважанні не заўсёды адэкватна ўспрымаліся непадрыхтаванымі слухачамі, якія са здзіўленнем сачылі за гісторыяй, арганізаванай паводле малазразумелай для іх логікі, што вынікала з унікальнага вопыту поўнага георгіеўскага кавалера. Акрамя таго, персанаж-франтавік ашчадна акумуляваў успаміны іншых, але ў такіх выпадках ён імкнуўся падкрэсліць крыніцу звестак: «Расказваў мне адзін, як гэта туркі там армянаў рэзалі. Людзей. Сам я не бачыў, дарма гаварыць не буду» [7, с. 488]. Георгіеўскі кавалер сумленна зазначаў, што падобныя гісторыі не былі ім верыфікаванымі, але, тым не менш, верагоднымі, карэлюючымі з яго ўласнымі назіраннямі, імпульсіўна выказанымі ў фразе «Божа мой!.. Божа мой!.. Рукі, ногі, галовы – навалам!.. І кішкі на дроце … Людзі – людзей, чалавек – чалавека!» [7, с. 472]. Падобны апавядач не мог узнаўляць падзеі мінулага з пазіцыі выпадковага назіральніка, што тлумачыць яго надзвычайную эмацыянальнасць, парадаксальнае жаданне то шматслоўна тлумачыць перажытае, то змаўкаць на самым цікавым месцы, выносячы ў адмысловы падтэкст свае высновы і назіранні, якія мала карэлявалі са стэрэатыпнымі ўяўленнямі пра вайну. Акрамя таго, кожная яго гісторыя прасякнута антываенным пафасам, бо рамантызаванне навалы, прапагандысцкія прамовы і гераізаванне ўласнага досведу супярэчыла светапоглядным дамінантам персанажа. Паказальна, што апавядальнік неаднойчы прыгадваў успаміны дзядзькі, пераконваўся ў яго імкненні да захавання праўдзівага слова пра вайну, бо час ад часу рэальныя факты ілюстравалі і ўдакладнялі расказанае. Гісторыі георгіеўскага кавалера дысанавалі з аповедамі некаторых сведак вайны, якія не імкнуліся зірнуць на падзеі шырэй і заўважыць не толькі яе прыгодніцкі патэнцыял («Ераплан нямецкі прыляціць, з такімі чорнымі крыжамі. Та-ра-лах-ціць!.. А салдацікі павыбягаюць з хатаў ды з вінтовачак: пух!.. пух!.. Ой, весела было!..» [7, с. 448]).

Галоўныя высновы Я. Брыля і апавядальніка з яго твора, якія нарадзіліся пад час знаёмства з вербальнымі і візуальнамі помнікамі той эпохі, звязаны з ненатуральнасцю феномена вайны, «рэальнасць цяжкасцей і пакут якой цяжка ўявіць, не паспытаўшы гэтага ў той ці іншай меры самому» [8, арк. 3], і камплементарнасцю розных крыніц інфармацыі, якія ў сукупнасці дазвалялі рэканструяваць больш-менш адэкватны малюнак узброенага глабальнага ўзаемавынішчэння людзей, якое выходзіла за межы асабістага вопыту падлетка. Адметнасцю паўсядзённага жыцця апавядальніка было і тое, што ён вучыўся жыць у соцыуме, што не хаваў жудасныя наступствы вайны: ён змушаў сябе без гідлівасці глядзець на дзяўчынку, якая ў мірны час атрымала калецтва ад выбуху бомбы, у яе «вырвала вока з брывом, патрушчыла сківіцу і рэбры з правага боку» [7, с. 443]; спрабаваў зразумець, што змушала былога прапаршчыка, які звар’яцеў у першай штыкавой атацы, час ад часу «з крыкам бегаць па чыстаполіцы, атакаваць у лоб ці акружаць які-небудзь пусты пагорак, лажыцца з размаху, зноў падхоплівацца, бегчы» [7, с. 470]; прыгадваў, што «таты з вайны вярталіся па-рознаму. Хто зусім цэлы, здаровы, хто трохі паранены, хто газу глытнуў і яшчэ ўсё бухукае <…> А некаторыя і не вярнуліся» [7, с. 484].

Падкрэслім, што аповесць «Золак, убачаны здалёк» мае шэраг канцэптуальных адрозненняў ад твораў, прысвечаных падзеям Першай сусветнай вайны, створаных як у 1920-я – 1930-я гг., так і ў другой палове ХХ ст. Варта звярнуць увагу на адметнасць аўтабіяграфічнай асновы ў кнізе Я. Брыля: у адрозненне, напрыклад, ад запісак «На імперыялістычнай вайне» М. Гарэцкага пісьменнік асэнсоўвае не ўласны ваенны досвед, а прапануе чытачу пазнаёміцца са шматузроўневай рэцэпцыяй падзей і наступстваў той навалы ад непасрэдных яе ўдзельнікаў і новага апавядальніка, які аналізуе ўсю багатую інфармацыю пра перажытае тады з пазіцыі нашчадка. Я. Брыль падкрэслівае, што і ён сам, і галоўны герой яго аповесці ўсё жыццё збіраюць-акумулююць «аўтэнтыку» той вайны, якая паўстае для іх не фактам біяграфіі, а відовішчам разбурэння і заняпаду, пракаментаваным іншымі, як аповед відавочцы, выбітны сваёй эмацыянальнай афарбоўкай, манерай выкладу матэрыяла, як адлюстраванне экстрэмальнага псіха-фізічнага стану асобных аднавяскоўцаў, як літаратурна-мастацкі ці дакументальны твор, журналісцкая нататка, фотаздымак. Назапашанне ведаў дапамагала заглыбіцца ў «вечныя» пытанні чалавецтва, высветліць сродкі захавання памяці народа, адзначыць майстэрства асобных апавядальнікаў ці аўтараў мастацкіх твораў, паразважаць пра ролю і абавязак аўтара ваеннай літаратуры перад чытачом.

Параўноўваючы аповесць «Золак, убачаны здалёк» з кнігамі Л. Дайнекі, Г. Далідовіча, В. Карамазава, І. Шамякіна, падкрэслім, што Я. Брыль засяроджваецца на гістарычным працэсе першай паловы ХХ ст., успрынятым праз прызму разважанняў асобнага персанажа, якая мае адметны аўтабіяграфічны характар. Акрамя таго, празаік закранае праблемы нараджэння твора, дзе аўтабіяграфічнае ўдакладняецца за кошт дакументальнага, потым гэтыя складнікі набываюць мастацкую цэльнасць за кошт моцнага суб’ектыўна-аўтарскага пачатку. У той жа час Л. Дайнека, Г. Далідовіч, В. Карамазаў, І. Шамякін адчувалі неабходнасць эпічна-мастацкага ўзнаўлення ўсіх падзей, якія прыпалі па першую трэць ХХ ст.; з эпічным пафасам яны адлюстроўвалі непарыўнасць і ўзаемаабумоўленасць ланцугу выпрабаванняў чалавека, які прыйшоў да новага ўсведамлення грамадска-палітычнага жыцця.

**Заключэнне.** Аповесць Я. Брыля «Золак, убачаны здалёк» – твор, у якім Першая сусветная вайна ўвасоблена як успамін, аповед сведкі, узор фальклору ці мастацкай літаратуры, дакумент, артэфакт з паўсядзённага жыцця, які «ажывае», калі да яго звяртаецца персанаж, які з маленства спрабуе стварыць адмысловы цэльны светапогляд – малюнак жыцця ў першай палове ХХ ст. Аўтабіяграфічнае, дакументальнае і мастацкае, паводле Я. Брыля, – камплементарныя складнікі, што дазваляюць шматаспектна разгледзець феномен вайны. Яна выходзіла за межы асабістага вопыту як апавядальніка, так і самога аўтара, аднак яе «гравітацыйнае поле», так ці інакш, прыцягвае ўвагу асобы ў розным узросце, выводзячы на першы план то незразумелае, авантурнае і брыдкае (далучанае да свету дарослых), то выбітна трагічнае, звязанае з вечнымі маральна-этычнымі пытаннямі. На

думку Я. Брыля, галоўны герой-апавядальнік прэзентуе досвед цэлага пакалення, якое інтэрыярызуе ваенны досвед старэйшых, і гэты досвед канцэптуальна ўзбагачае светапогляд наступнікаў, падводзіць маладзейшых да ўсведамлення ўласнага існавання у той самай плыні навалы-кантынуума. Пісьменнік прапануе зірнуць на Першую сусветную не толькі як на гістарычны, але і літаратурна-мастацкі феномен, сугестыўны патэнцыял якога ўражвае кожнага, хто з ім сутыкнуўся. Аўтар падкрэслівае, што адносна аб'ектыўны малюнак эпохі складаецца з суб'ектыўна афарбаваных успамінаў (напрыклад, узноўленыя ў аповесці гісторыі георгіеўскага кавалера), спроб інтэрпрэтацыі падзей (у тым ліку, у форме салдацкага ці бежанскага наратыву, вуснай народнай творчасці), якія ўдакладняюцца за кошт захаванай «фактуры» вайны: напаўразбураных акопаў, калючага дроту, бліндажоў, зруйнаваных збудаванняў, выпадкова захаваных боепрыпасаў. Не менш значнымі для ўспрыняцця эпохі былі розныя яе дакументы: газетныя і часопісныя нататкі, мемуары знакамітых асоб, інфармацыя са спецыяльных даследаванняў.

У аповесці «Золак, убачаны здалёк» рэалізаваны шэраг рыс, характэрных для метапрозы: перш за ўсё, чытач назірае за нараджэннем адмысловай мастацкай рэальнасці, якая імкнецца вытлумачыць спецыфіку свайго існавання, раскрыць адметнасць мыслення апавядальніка, яго стаўленне да Першай сусветнай вайны як аднаго з трыгераў творчага спасціжэння свету.

ЛІТАРАТУРА


1. Бугаёў Д. Служэнне Беларусі (Янка Брыль) // Спавядальнае слова: Літаратурная крытыка, успаміны. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2001. – С. 28–39.
2. Губская В. Аўтабіяграфічны наратыў Янкі Брыля: спецыфіка вобраза аўтара // Стылістыка: мова, маўленне і тэкст: матэрыялы V Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 100-годдзю заслуж. работніка адукацыі Рэсп. Беларусь, д-ра філал. навук, праф. М.Цікоцкага, Мінск, 23–24 лют. 2022 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: В.М. Самусевіч (гал. рэд.). – Мінск: БДУ, 2022. – С. 82–88.
3. Брыль Я. Свае старонкі // Збор твораў: у 5 т. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1981. – Т. 5: Лірычныя запісы і мініяцюры. – С. 385–588.
4. Альштынюк А. Праблема аўтабіяграфізму ў творчасці Янкі Брыля. – Białystok : Uniwersytet w Białymstoku, 2017. – 211 с.
5. Скибицкая Л. Структура художественного повествования в повестях В. Астафьева и Я. Брыля («Последний поклон» и «Золак, убачаны здалёк») // Русская и белорусская литературы на рубеже XX – XXI вв.: сб. науч. ст. В 2 ч. – Ч. 1 / под ред. С. Гончаровой-Грабовской. – Минск: РИВШ, 2010. – С. 124–129.
6. Сінькова Л. Што можна пазначаць тэрмін «дакументальна-мастацкая проза» // Беларуская «звышлітаратура»: літаратуразнаўчыя і літаратурна-крытычныя артыкулы. – Мінск: Кнігазбор, 2019. – С. 70–78.
7. Брыль Я. Золак, убачаны здалёк // Збор твораў: у 5 т. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. – Т. 2: Аповесці. – С. 424–510.
8. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛІМ). – Ф. 59. Воп. 2. Спр. 9. Арк. 1 – 13.
9. Брыль Я. Адзінае наша // Сёння і памяць: Апавяданні, мініяцюры, эсэ. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. – С. 204–209.
10. Адамовіч А. Праз гады і творы // Збор твораў: у 5 т. / Я. Брыль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1980. – Т. 1: Апавяданні. – С. 5–8.
11. Брыль Я. Свае старонкі. Да творчай аўтабіяграфіі // Сёння і памяць: Апавяданні, мініяцюры, эсэ. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. – С. 209–315.


*Паступіў 15.05.2024*

## АВТОБИОГРАФИЧЕСКОЕ, ДОКУМЕНТАЛЬНОЕ И ХУДОЖЕСТВЕННОЕ КАК КОМПЛЕМЕНТАРНЫЕ СРЕДСТВА КОНСТРУИРОВАНИЯ ДЕЙСТВИТЕЛЬНОСТИ ПЕРВОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ В ПОВЕСТИ Я. БРЫЛЯ «РАССВЕТ, УВИДЕННЫЙ ИЗДАЛЕКА»

***д-р филол. наук, доц. З.И. ТРЕТЬЯК***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*В статье рассматривается повесть Я. Брыля «Рассвет, увиденный издалека», посвященная осмыслению феномена «бедствие-континуум», включающего в себя события Первой мировой войны. По замыслу автора, рассказчик, который номинально не мог быть сознательным свидетелем боевых действий, постепенно реконструирует события 1914–1918 гг., затронувшие жизнь его семьи и односельчан (шире белорусского народа). Отмечается комплементарная роль визуального и вербального аспектов понимания военной действительности. Подчеркивается суггестивный потенциал буквально каждого материального предмета, рассказа участника событий, документального, фольклорного или литературно-художественного источника, что в совокупности позволило рассказчику создать адекватную словесную картину мировой войны. Выявлен ряд особенностей, свидетельствующих о связи произведения с метапрозой, что определяет концептуально иное место повести во всем диапазоне белорусской литературной баталистики, посвященной событиям 1914–1918 гг.*

***Ключевые слова:*** *Первая мировая война, белорусская литература, Я. Брыль, автобиографический, документальный, художественный элементы повествования, метапроза.*

# AUTOBIOGRAPHICAL, DOCUMENTARY AND ARTISTIC AS COMPLEMENTARY MEANS CONSTRUCTING THE FIRST WORLD WAR REALITY IN THE STORY ‘DUSK SEEN FROM AFAR’ BY YA. BRYL

***Z. TRATSIAK***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article examines Ya. Bryl’s story ‘Dusk Seen from Afar’, dedicated to the concept of the ‘continuous disaster’, which includes the events of the First World War. According to the author’s plan, the narrator, who nominally cannot be treated as a conscious witness to the hostilities, gradually reconstructs the events of 1914–1918, which affected the life of his family and fellow villagers (in the wider context Belarusian people). The complementary role of visual and verbal aspects the artistic representation of military reality is noted. The suggestive potential of literally every material object, participant story, documentary, folklore or literary source is emphasized. Taken together they allowed the storyteller to create an adequate verbal picture of the world war. A number of features that testify to the connection of the work with metaprose are identified. They determine the conceptually different place of the story in the entire range of Belarusian war literature, dedicated to 1914–1918.*

***Keywords:*** *World War I, Belarusian literature, Ya. Bryl, autobiographical, documentary, fictional elements of narration, metafiction.*